**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Зенькавіцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя А.І.Якімовіча”**

# Маршрут выхаднога дня
# «У госці да птушак»

Перад пачаткам паходу дзецям патрэбна нагадаць правілы паводзін на прыродзе.

*Забараняецца:*

1. Крычаць;
2. Рваць, таптаць расліны;
3. Разводзіць вогнішчы;
5. Разбураць жыллё жывёл;
6. Лавіць птушак і насякомых.

*Дазваляецца:*

1 . Карміць жывёл з дазволу старэйшых;
2. Любавацца раслінамі, жывёламі;
4. Абараняць месцы гнездавання птушак;
5. Сачыць за чысцінёй прыроднага згуртавання.

Прапануйце дзецям зрабіць агляд лугу: прыгледзецца ўдалячынь, адзначыць дрэвы, рэдкія хмызнякі, звярнуць увагу на рознакаляровыя кветкі.

Прайдзіцеся разам з дзецьмі па лузе, ляжце ў траву і паслухайце гукі, адчуйце пахі.

Тут адбываецца знаёмства з раслінамі - рамонкам, званочкам, дзьмухаўцом, трыпутнікам і г.д. Патрэбна падкрэсліць, што кветкі рваць нельга, можна толькі пяшчотна дакранацца да іх і любавацца прыгажосцю.

*Сонца ім ласкі не шкадавала,*
*сонечнай фарбаю пафарбавала.*
*Ой жа якія прыгожыя кветкі!*
*Ляцяць да іх пчолкі, бягуць да іх дзеткі.*
*Пчолкі мядок салодкі збіраюць,*
*дзеткі вянкі на галоўку сплятаюць … (Дзьмухавец)*

*У лужку-лужочку*
*выраслі сястрычкі:*
*залатое вочка,*
*белыя раснічкі. (Рамонак)*



*Цвіў усё лета я,*
*жыву звычайна ў жыце.*
*Нашу хлапечае імя.*
*Як зваць мяне скажыце? (Васілёк)*

**Звярніце ўвагу дзяцей на трыпутнік або падарожнік** — лекавая трава, якая расце паўсюдна і ўжываецца часцей за іншыя травы для лячэння ран і парэзаў.

"Зялёны лекар падарожных" – трыпутнік, нязменна побач з чалавекам. Калі здараецца так, што падрапалі каленку ці локаць і побач не аказалася лекавых сродкаў, не бяда, трэба ўзяць падарожнік, прамыць яго пад вадой і прыкласці да раны. Кроў хутка спыніцца.

**Пагуляйце з дзецьмі ў гульню «Назаві колер»**

Дарослы кідае мяч і называе кветку *(рамонак, васілёк, незабудка і г.д.),* дзіця ловіць мяч, называе адпаведны колер *(чырвоны, зялёны, белы, сіні і г. д.)* і кідае мяч назад.

**Артыкуляцыйная гімнастыка**

Жых-жых-жых - жук лётае і гудзе.
Са-Са-са - прыляцела да нас аса.
Ра-ра-ра - рады бачыць камара.
Ля-Ля-ля – вось вясёлая пчала.
За-за-за – прыляцела страказа.
Як можна назваць адным словам гэтых жывых істот? (Насякомыя)

**Дыдактычная гульня «Правілы лугу»**

Дзеці і дарослыя, стоячы ў крузе перадаюць адзін аднаму мячык і прагаворваюць правілы:

1. Нельга рваць кветкі.
2. Нельга лавіць насякомых і забіраць іх дадому.
3. Нельга кідаць смецце.
4. Нельга падпальваць сухую траву.

**Рухомая гульня “Матылькі на лузе”**

Дзеці – матылькі, дарослы – вядучы з сачком. Матылькі лётаюць, вядучы ходзіць па лузе з сачком і кажа словы:

На лужке, на луге
Мотыльки летали.
Всех увидеть я смогу,
Всех я посчитаю!



Раз, два, три, чатыре, пять,
Буду мотыльков считать:
Кто на лепестке, на пунсовеньком цветке,
Кто на веточке,
А кто в сеточку.
Ты замри, не шелохнись,
И в цветочек превратись!

На апошнія словы матылькі прысядаюць і заміраюць. Вядучы ходзіць паміж імі, ловіць матылеў сачком, хто з іх варушыцца, таго злавілі (выбывае з гульні). Далей ролю вядучага можа выконваць дзіцёнак.

**Рухомая гульня “Злаві камара”**

Да вяровачкі прывязваюць хустачку – "камар". Вяроўку з камаром можна прымацаваць да ветачкі, а можна трымаць у руцэ. Дарослы трымае вяровачку, вышэй паднятай рукі дзіцяці. Дзеці, падскокваючы, імкнуцца злавіць камара далонямі.

***Прапануйце дзецям ажыццявіць «Прывал»***

П'ем гарбату на прывале: дарослыя прапануюць дзецям дастаць з рукзачкоў кружкі і папіць гарбаты з бутэрбродамі; нагадваюць, што смецце пакідаць пасля сябе нельга.

Пасля адпачынку группа рухаецца да наступнага прыпынку.

-Дзеці, скажыце, у вас сёння добры настрой? Давайце яго палепшым.

Гэй, гарэзы, усім ку-ку,
Хто стаіць там у баку?
Хуценька сюды бяжыце,
За руку сяброў бярыце.
Усміхнёмся тым, хто злева,
Усміхнёмся тым, хто справа.
Мы ўсе разам ад рання
Вельмі дружная сям’я!

-Ой, вы чуеце незвычайны гук? Гэта на мой тэлефон прыйшло гукавое пісьмо. Давайце яго паслухаем.

*«Карр-Карр! Бяда-бяда! Птушкі не вярнуліся з цёплых краёў. Злая ведзьма іх зачаравала. Я вырашыла звярнуцца па дапамогу да вас, у дзіцячы сад. Бо лепшага сябра, чым вы, для птушачак не знайсці. Дзеці, дапамажыце, калі ласка, расчаруйце птушак!”*

-**А**д каго прыйшла паштоўка? *Асоба ўсім вядомая, яна крыкуха мясцовая*



*(варона)*. Вой, вой і сапраўды бяда! Дапаможам расчараваць птушак? Я думаю, што нашы веды і ўменні нам дапамогуць.

*Пытанні дарослага*

1. Як называюць птушак, якія на зіму ляцяць у вырай? (*Пералётныя)*
2. А як называюцца птушакі, якія на зіму застаюцца з намі? *(Зімуючыя)*
3. У які час года птушак больш? *(Летам)* Чаму? *(І зімуючыя, і пералётныя)*
4. Якіх птушак зачаравала ведзьма, хто не вярнуўся з поўдня? *(Пералётныя)*
5. У які час года яны вяртаюцца? *(Вясной)*

-Дзеці, а давайце паспрабуем птушак паклікаць.

*Жаваранкі-жаваронaчкі,*
*Перапёлкі-перапёлачкі.*
*Прыляціце да нас,*
*Прынясіце нам*
*Лета цёплае.*

-Нічога не атрымліваецца, не вяртаюцца птушкі, не чуваць іх галасоў. Што рабіць і не ведаю.

Прыдумала! Калі вы выканаеце ўсе заданні, то птушкі прыляцяць і заспяваюць. Вы згодныя прайсці такое выпрабаванне?

**Прапануйце дзецям выканаць заданне:**

**1 гульня з мячом «Зславі і назаві»**

Дарослы кідае мяч дзіцяці, той вяртае мяч і называе пералётную птушку.

**2 заданне "Хто лішні"**

У руках дарослага малюнкі птушак, дзеці падыходзяць і выбіраюць птушак, застаюцца толькі зімуючыя птушкі, дзеці тлумачаць чаму.

**3 заданне "Завучы чыстагаворку"**

"Белы бусел баіў байку беламу зайку"

**4 заданне "Хто які?"**

**Дарослы:** калі ў бусла доўгі клюў. Бусел які? - Доўгаклювы.
У бусла чырвоная дзюба - чырванадзюбы.
У грача чорныя вочы - чарнавокі.
У лебедзя доўгая шыя - даўгашыі.
У жураўля шырокія крылы - шырокакрылы.
У чаплі доўгія ногі - даўганогая.
У шпака чорныя пёры – чорнапёры.



## 5 заданне “Гульня “Птушкі, гнёзды, птушаняты”

Па камандзе «Птушкі»-дзеці рухаюцца на носочках, узмахваючы рукамі. Па камандзе "Гнёзды" - збіраюцца ў адным месцы, узяўшыся за рукі і па просьбе дарослага пераймаюць голас патрэбнай птушкі. (зязюля: ку-ку, качка: кра-кра, ластаўка: фьють-фьють, журавель: курлы-курлы, гусь: га-га.)

-Вось, апошняе заданне, калі справіцеся, то расчаруеце птушак і яны прыляцяць да нас і мы пачуем іх галасы.

## 6 заданне “Здагадайся, што за птушка”

*У шэрай шубцы пер’явой,*
*І ў марозы ён герой.*
*Назаві яго хутчэй!*
*Хто там скача?.. (Варабей)*

*Гэта птушка так балбатліва,*
*Як той злодей, мітуслівa.*
*Стракатунння, белабока,*
*А завуць яе…(Сарока)*

*Чорная шапачка*
*І палоска шалічка*
*Жоўтая спаднічка*
*Завуць яе…(Сінічка)*

*Сама ўся шэраватая,*
*Паходка мешкаватая.*
*Важная пярсона-*
*Завуць яе …( Варона)*

*Маленькая птушка,*
*што жыве ўлетку ў шпакоўні,*
*А вяртаецца яна домоў*
*Ранняй вясною. (Шпак)*

-Дзякуй вам дзеці! Вось, птушкі вярнуліся, мы атрымалі перамогу над вядзьмарствам злой ведзьмы.*(Прапануецца загадзя падрыхтаваць падарункі для дзяцей за удзел у вызваленні птушак)*

Дарослы прапануе дзецям паназіраць за шпакамі, якія жывуць у шпакоўні на бярозе, разгледзець знешні выгляд шпака, яго звычкі.

Спытайце ў дзяцей, а якую карысць прыносяць птушкі людзям? Давайце ўсе разам папросім людзей берагчы птушак. –Беражыце птушак!!! Малайчынкі! Сапраўдныя героі. Дзякуй за дапамогу.

Прапануйце дзецям **дома** зрабіць малюнак аб уражаннях сёняшняга дня.



Паспрабуйце прачытаць дзецям верш, а яны няхай выправяць ў ім памылкі.

Мы приехали на речку воскресенье провести,

А свободного местечка возле речки не найти!

Тут сидят и там сидят: загорают и едят,

Отдыхают как хотят, сотни взрослых и ребят!

Мы по бережку пошли и поляночку нашли.

Но на солнечной полянке тут и там – пустые банки

И, как будто нам назло, даже битое стекло!

Мы по бережку пошли, место новое нашли.

Но и здесь до нас сидели;

Тоже пили, тоже ели, жгли костер, бумагу жгли – насорили и ушли!

Мы прошли, конечно, мимо …

- Эй, ребята! – крикнул Дима. – Вот местечко хоть куда! Родниковая вода! Чудный вид!

Прекрасный пляж! Распаковывай багаж!

Мы купались, загорали, жгли костер, в футбол играли.

Веселились как могли! Пили квас, консервы ели, хоровые песни пели …

Отдохнули – и ушли!

И остались на полянке у потухшего костра:

Две разбитых нами склянки, две размокшие баранки – словом, мусора гора!

Мы приехали на речку понедельник провести,

Только чистого местечка возле речки не найти!

Дарослыя разам з дзецьмі робяць выснову з верша і выказваюць свае думкі.